## Як звязана лічба 75 з гісторыяй нашай краіны?

Зрабіць першы ўрок для малодшых школьнікаў цікавым і запамінальным дапамогуць наступныя заданні:

**1) “Вылічальныя ланцужкі”.**

81:3+13+35

18+2+30+5+20

360:12+25- 15+35

*Прыклады складаюцца у адпаведнасці з узростам вучняў. Адказ ва усіх прыкладах — 75.*

Гэта лічба невыпадковая. Як звязана яна з гісторыяй нашай краіны?

**2) “Арфаграфічная размінка”.**

Устаў літары і даведайся прозвішча аднаго з герояу Вялікай Айчыннай вайны.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | с..сновы | | р..кі | | м..рскі | |
| М | ц..гляны | ш | ц..ны | р | л..сіха | ў |
| | м..лады | | стр..лы | | р..чулка | |

*Атрымліваецца “Машэраў”.*

Да вайны працаваў настаўнікам матэматыкі і фізікі ў Расонскай сярэдняй школе, што на Віцебшчыне. Ужо ў жніуні 1941 года стварае падпольную групу, куды ўвайшлі амаль усе яго вучні. Вясною гэта быў ужо цэлы партызанскі атрад. У 1944 годзе Пятру Міронавічу Машэраву было прысвоена званне Герой Савецкага Саюза. Яго імя носяць і вуліцы гарадоў і мястэчкаў.

**3) “Дагаварыце сказ”** (*настаўнік пачынае сказ і кідае мяч аднаму з вучняў*):

— Гораду Брэсту споўнілася…(1000 гадоў).

— Дзень Незалежнасці наша краіна святкуе… (3 ліпеня).

— Міжнародны фестываль “Славянскі базар” праходзіць у… (Віцебску).

— Ф.Скарына нарадзіўся у горадзе… (Полацку).

— ІІ Еурапейскія гульні прайшлі ў… (Мінску).

**4) Складзіце сінквейн “Мінск”:**

Мінск

Чысты, утульны

Будуецца, расце, прыгажэе

Гасцінна сустракае сваіх сяброў

Сталіца

**5) “Знайдзіце сувязь”**.

*Настаўнік называе горад, а вучні прадукцыю, якая у ім вырабляецца. Напрыклад, Жабінка — цукар; Мінск — трактары, аутобусы, халадзільнікі; Пінск — мэбля, трыкатаж; Брэст — газавыя пліты. Або, наадварот, самазвалы “БелАЗ” — Жодзіна; цукеркі — Мінск, Гомель; пасцельная бялізна — Баранавічы; дываны — Брэст, Віцебск.*

**6) “Суаднясіце месцазнаходжанне”.**

Абеліскі і помнікі сталі напамінам аб жудаснай вайне. Успомніце, дзе ўстаноўлены помнікі і манументы:

Манумент у гонар Маці-патрыёткі (Мінск).

Помнік Марату Казею (Орша).

Помнік Канстанціну Заслонаву (паблізу Магілёва).

Манумент "Мужнасць"  (Жодзіна).

Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць" (Буйніцкае поле).

**Ларыса ПЕТУХОВА, настаўніца пачатковых класаў Белавежскай сярэдняй школы Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.**